## Білет 6

**Практычнае заданне.**
**Грамадска-палітычнае жыццё ў БССР у другой палове 1940-х – 1980-ыя гг.**

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні (выканайце заданні):**

1. Каму належала вышэйшая заканадаўчая і выканаўчая ўлада ў БССР у 1978-1991 гг.?
2. Якую ролю адыгрывала Камуністычная партыя ў грамадска-палітычным жыцці БССР у другой палове 1970-х - 1980-я гг.?
3. Чаму БССР называлася Савецкай рэспублікай? Пацвердзіце адказ цытатамі з прадстаўленых матэрыялаў.
4. Састаўце схему: Формы ўдзелу грамадзян БССР у грамадска-палітычным жыцці рэспублікі.

**І. З Канстытуцыі БССР (1978 г.)**

Артыкул 1. Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка ёсць сацыялістычная агульнанародная дзяржава, якая выражае волю і інтарэсы рабочых, сялян і інтэлігенцыі, працоўных рэспублікі ўсіх нацыянальнасцей.

Артыкул 2. Уся ўлада ў Беларускай ССР належыць народу. Народ ажыццяўляе дзяржаўную ўладу праз Саветы народных дэпутатаў, якія складаюць палітычную аснову Беларускай ССР.

Артыкул 6. Кіруючай і накіроўваючай сілай савецкага грамадства, ядром яго палітычнай сістэмы, дзяржаўных і грамадскіх арганізацый з'яўляецца Камуністычная партыя Савецкага Саюза. […]. Узброеная марксісцка-ленінскім вучэннем, Камуністычная партыя вызначае генеральную перспектыву развіцця грамадства, лінію ўнутранай і знешняй палітыкі СССР; кіруе вялікай стваральнай дзейнасцю савецкага народа, надае планамерны, навукова абгрунтаваны характар яго барацьбе за перамогу камунізму.

Артыкул 7. Прафесійныя саюзы, Усесаюзны Ленінскі Камуністычны Саюз Моладзі, кааператыўныя і іншыя грамадскія арганізацыі ў адпаведнасці са сваімі ўстаўнымі задачамі ўдзельнічаюць у кіраванні дзяржаўнымі і грамадскімі справамі, у рашэнні палітычных, гаспадарчых і сацыяльна-культурных пытанняў.

Артыкул 97. Вышэйшым пастаянна дзеючым органам дзяржаўнай улады Беларускай ССР з'яўляецца Вярхоўны Савет Беларускай ССР.

Артыкул 115. Савет Міністраў Беларускай ССР – Урад Беларускай ССР – з'яўляецца вышэйшым выканаўчым і распарадчым органам дзяржаўнай улады Беларускай ССР.

Артыкул 124. Органамі дзяржаўнай улады ў абласцях, раёнах, гарадах, раёнах у гарадах, пасёлках, сельскіх населеных пунктах з'яўляюцца адпаведныя Саветы народных дэпутатаў.

**II. Удзел насельніцтва БССР у грамадска-палітычным жыцці** *(па матэрыялах вучэбнага дапаможніка "Гісторыя Беларусі. 1917 г. – пачатак XXI ст. 9 клас")*.

Грамадская актыўнасць насельніцтва БССР была дастаткова высокай. Спрыяльным фактарам у фарміраванні станоўчых адносін жыхароў рэспублікі да ўдзелу ў грамадска-палітычным жыцці і палітыцы партыі з'яўлялася павышэнне ўзроўню жыцця насельніцтва. Немалаважнае значэнне мела і дзейнасць партыйных і дзяржаўных кіраўнікоў.

Грамадзяне БССР удзельнічалі ў выбарах і рабоце Саветаў народных дэпутатаў, партыйных, прафсаюзных, камсамольскіх і іншых грамадскіх арганізацый.

У БССР, таксама як і ў іншых савецкіх рэспубліках, рэгулярна арганізоўваліся масавыя сходы, мітынгі, грандыёзныя вулічныя шэсці, прысвечаныя святкаванню дзён Кастрычніцкай рэвалюцыі і Першага мая, Перамогі і вызваленню БССР ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. З вялікай урачыстасцю адзначаліся ленінскія дні, знамянальныя даты ў гісторыі КПСС, выбары ў Саветы народных дэпутатаў, прыняцце новай Канстытуцыі СССР 1977 г. і Канстытуцыі БССР 1978 г.

**III. З даклада П.М. Машэрава на нечарговай дзявятай сесіі Вярхоўнага Савета БССР (1978 г.)**

«З першага і да апошняга дня гэтай важнай палітычнай кампаніі працаўнікі гарадоў і сёлаў праявілі высокую актыўнасць, сапраўдную зацікаўленасць у тым, каб Асноўны Закон БССР (1978 г.) абвяшчаў і замацоўваў усе найбольш істотныя і важныя бакі нашых дасягненняў і заваёў у брацкай сям'і савецкіх народаў, забяспечваў новыя магчымасці для эканамічнага і сацыяльнага прагрэсу рэспублікі.

Усяго было праведзена больш за 70 тыс. сходаў, у якіх прынялі ўдзел каля 6 млн.чал. Пры абмеркаванні праекта выступіла звыш 327 тыс. чал. Яны ўнеслі больш за 330 тыс. прапаноў і заўваг…».